**УДК 811.161.3’42’373.612.2:821.161.3-1*Я.Колас**
***К. А. Барысенка***

# ЭПІТЭТЫ Ў ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА “СЫМОН-МУЗЫКА”

*У артыкуле разглядаюцца мастацкія азначэнні, выяўленыя ў мове паэмы Якуба Коласа “Сымон-музыка”, адзначаюцца спосабы марфалагічнага выражэння мастацкіх азначэнняў, характарызуецца пашыранасць эпітэтаў як сродкаў выяўленчай выразнасці паэтычнай мовы. Асобная ўвага аддаецца выкарыстанню сталых эпітэтаў, а таксама частотнасці эпітэтаў-прыдаткаў. Мастацкія азначэнні спрыяюць вобразнасці і эмацыянальнасці мовы паэмы.*

Эпітэт – гэта азначэнне, якое па-мастацку аздабляе аповед, дае яскравую характарыстыку названым у тэксце асобам, прадметам і працэсам. Тэрмін *эпітэт* паходзіць з грэчаскай мовы: *epitheton* ‘прыдатак’. Паводле літаратуразнаўчых слоўнікаў, “эпітэт – від простага тропа, мастацкае акрэсленне істотнай прыметы якога-небудзь прадмета ці з'явы” [1].

Эпітэты з’яўляюцца адным з найбольш распаўсюджаных сродкаў выяўленчай выразнасці ў мове мастацкіх твораў і пашыраным моўным сродкам твораў вуснай народнай творчасці.

Усе беларускія пісьменнікі абавязкова выкарыстоўвалі эпітэты ў мове сваіх твораў. Для індывідуальнага стылю адных пісьменнікаў мастацкія азначэнні надзвычай характэрныя, а ў мове твораў іншых эпітэты не з’яўляюцца колькасна пераважаючым вобразна-выяўленчым сродкам.

Вялікая колькасць эпітэтаў сустракаецца ў мове твораў Якуба Коласа. Паэма Якуба Коласа “Сымон-музыка” – “гэта твор аб народных вытоках мастацтва, лёсе таленту з народа, духоўным адраджэнні нацыі. Трагічныя і драматычныя матывы ў ім пераплятаюцца з жыццесцвярджальнымі і аптымістычнымі” [2].

У мове паэмы Якуба Коласа “Сымон-музыка” мастацкія азначэнні з’яўляюцца даволі прыкметным моўным сродкам. Эпітэты, выкарыстаныя Я. Коласам, маюць рознае граматычнае выражэнне.

Найбольш часта ўжываюцца азначэнні, выражаныя прыметнікамі: “*Парасонам Ліпы* ***пышнай*** *і* ***зялёнай***” [3]; “*У такт нейкім* ***дзіўным*** *спевам*” [3]; “*Нейкі* ***радасны*** *парыў*” [3].

Мастацкія азначэнні, выражаныя прыметнікамі, часцей вобразна характарызуюць з’явы прыроды: “*У* ***салодкім*** *заміранні* ***Ясным*** *зоркам на спатканне*” [3]. Як паказваюць прыведзеныя прыклады, эпітэты, выражаныя прыметнікамі, Якуб Колас уключаў у склад метафар: “***І бяздонныя*** *амшары Зоркі высцелюць руном*” [3].

Для мовы паэмы “Сымон-музыка” характэрным з’яўляецца выкарыстанне эпітэтаў для апісання ўласцівасцей адцягненых з’яў: “*І вясенька маладая Для цябе – у* ***вечнай*** *страце*” [3].



Вобразнасць мове паэмы надаюць мастацкія азначэнні, выражаныя прыметнікамі, для якіх уласціва метафарычнасць: “*Збіраўся скарб, струменіўся няспынна,* ***Вясёлкавым*** *ірдзеннем мне спяваў*” [3].

Метафарычныя эпітэты, выражаныя прыметнікамі, часта сустракаюцца ў мове паэмы: “*І няслі яе высока Над* ***гаротнаю*** *зямлёй*” [3].

У мове паэмы сустракаюцца эпітэты, выражаныя дзеепрыметнікамі. Гэтыя дзеяслоўныя формы сумяшчаюць магчымасць адлюстраваць дзеянне або працэс і адначасова ахарактарызаваць яго. Эпітэты, выражаныя дзеепрыметнікамі, могуць уваходзіць у склад дзеепрыметных зваротаў. І тады ствараецца вобразна-выяўленчы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сродак, які мае структуру словазлучэння:
*І гэты скарб,* ***пазычаны, адбіты,***
***У сэрцы перажыты***
*І росамі абмыты* [3].
Эпітэты, выражаныя дзеепрыметнікамі, у тэксце паэмы часта ўжываюцца ў сукупнасці з азначэннямі, выражанымі іншымі граматычнымі спосабамі. Такі прыём выкарыстоўваецца для вобразнай характарыстыкі асоб:
*А Сымон адзін зусім,*
*Торбу звесіўшы праз плечкі,*
*Ідзе воддалек за ім,*
*Ды* ***маўклівы****, бы акуты*
*Гэтым горам і бядою*
*І* ***бязмернаю*** *жудою*
*Да зямлі быў дух* ***прыгнуты*** [3].
Надзвычайную мастацкую выразнасць мове паэмы надаюць азначэнні, выражаныя прыметнікамі, якія па паходжанні з'яўляюцца дзеепрыметнікамі і ў выніку ад'ектывацыі метафарызаваліся:
*Бацька ў роспачы, у злосці*
*Кінуў жмут* ***калючых*** *слоў* [3].
Вялікую групу мастацкіх азначэнняў, што Якуб Колас выкарыстаў у паэме "Сымон-музыка", складаюць сталыя эпітэты, якія маюць вытокамі беларускі фальклор. З вуснай народнай творчасці паходзяць сталыя характарыстыкі асобных з'яў:
– пясок – жоўты: "*Я насыплю горку* ***Жоўтага*** *пясочку*" [3];
– вочы – шэрыя: "*Вочы* ***шэрыя*** *прыжмурыць І мірглне вятру-арлу*" [3].
Асобныя фальклорныя эпітэты адзначаюцца ў паэме часцей за іншыя. Пашыраным сталым мастацкім азначэннем з'яўляецца прыметнік *залаты*. У паэме Якуба Коласа такое азначэнне маюць:
– сонца: "***Залатыя*** *сонца далі*" [3];
– струны званара: "*А калі званар, бывала,* ***Залатыя*** *ўзбудзіць струны*" [3].
Несумненныя фальклорныя карані маюць і эпітэты, выражаныя прыметнікамі з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі:
*Правяду разорку*
***Беленькім*** *кіёчкам.*
*Шу-шу-шу! – пясочак*
*Шурхнуў* ***залаценькі****.*
*Пясок – мой дружочак,*
***Дробненькі-драбненькі*** [3].
Услед за творамі вуснай народнай творчасці Якуб Колас выкарыстоўвае ў мове паэмы прыём падваення мастацкіх азначэнняў, што садзейнічае выразнасці паэтычнага твора:

*У Сымонкі ў вочках, твару*
*Бегаў* ***ціхі-ціхі*** *смех* [3].
Неабходна заўважыць пра такі спосаб выражэння, як прыдатак. Прыдатак, як правіла, выражаецца назоўнікам і паводле сінтаксічных адметнасцях з'яўляецца недапасаваным азначэннем. У паэме Якуба Коласа такія эпітэты характарызуюць з'явы прыроды:
*Добра ў полі: волі многа*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*І* ***прастору-шырыні***» [3];
*Граў прашчанне жыццю лета,*
***Спеву-радасці*** *далін*» [3];
***Шуму-гоману*** *багата,*
*Нейкі рух усіх бярэ* [3].
Больш дакладна ўяўляюцца азначаныя з дапамогай эпітэтаў-прыдаткаў прадметы і рабочыя прылады:
*Ён праслухаў навучанку,*
*Як быць добрым пастухом,*
*Справіў* ***пугу-павіванку*** [3].
І нават псіхалагічны стан асобы таксама часам характарызуецца менавіта шляхам выкарыстання эпітэтаў-прыдаткаў
*І ў* ***самоце-адзіноце***
*Песні, байкі ён тварыў* [3].
А часам сустракаецца ў мове паэмы «Сымон-музыка» спалучэнне некалькіх эпітэтаў-прыдаткаў:
*Ды з* ***кішэні-бакавушкі***
*Выняў* ***дудку-весялушку*** [3].
Выяўленчая выразнасць мовы паэмы Якуба Коласа дасягаецца спалучэннем у радках мастацкіх азначэнняў з розным спосабам выражэння: праз прыметнікі, дзеепрыметнікі, прыдаткі:
*Так, абрыўкі* ***з'яў-малюнкаў****,*
*Слоў* ***нязвязаных*** *нічым,*
***Недарэчных*** *вырахункаў, –*
*Ўсё вілося перад ім* [3].
Спалучэнне эпітэтаў, выражаных рознымі граматычнымі спосабамі, надае паэтычнай мове маляўнічасці і выразнасці: “*Вочы* ***шэрыя*** *прыжмурыць І міргне* ***вятруарлу***” [3].
Паказаны прыём выяўленчай выразнасці мовы паэт выкарыстаў для апявання не толькі з’яў прыроды, але разнастайных адцягненых паняццяў. Напрыклад, менавіта эпітэт-прыдатак разам з індывідуальна-аўтарскім вобразным азначэннем Якуб Колас ужыў для ўхвалення народна-паэтычнай песеннай творчасці:
*І выхаду шукаў*
*Адбітак родных з'яў*
*У* ***словах-вобразах****, у песнях* ***вольнаплынных*** [3].
Спалучэнне некалькіх мастацкіх азначэнняў у мове паэмы “Сымон-музыка” выкарыстоўваецца таксама для трапнай характарыстыкі асобы:
*Гэты дзед – пастух гуртовы,*
***Слаўны*** *дзед,* ***дзядок – душа*** [3].
Такім чынам, у мове паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка» мастацкія азначэнні сустракаюцца надзвычай часта. Выяўленыя эпітэты маюць розныя спосабы граматычнага выражэння, самымі пашыранымі з якіх з’яўляюцца прыметнікі і назоўнікі. Эпітэты,

выражаныя назоўнікамі, паводле сінтаксічнай функцыі, з’яўляюцца прыдаткамі. У мове паэмы Якуба Коласа “Сымон-музыка” выкарыстоўваюцца індывідуальна-аўтарскія, агульнамоўныя і сталыя эпітэты, якія маюць вытокі ў вуснай народнай творчасці. Мастацкія азначэнні спрыяюць вобразнасці і эмацыянальнасці мовы паэмы.
**Літаратура**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1 Эпітэт [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://karotkizmest.by/слоўнік/э/эпітэт.html. – Дата доступу : 25.04.2022.
2 Якуб Колас: асоба і творчасць [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://archives.gov.by/home/tematicheskie-razrabotki-arhivnyh-dokumentov-i-bazy-dannyh/vydayushhiesya-lichnosti/klasiki-susvetnaj-litaratury-yanka-kupala-i-yakub-kolas/klasik-susvetnajlitaratury-yakub-kolas/yakub-kolas-asoba-i-tvorchascz. – Дата доступу : 03.05.2022.
3 Колас, Якуб. Сымон-музыка / Якуб Колас [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://knihi.com/Jakub_Kolas/Symon-muzyka.html. – Дата доступу : 03.05.2022

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ